*УДК 37.091.12:005.963.3*

# ПРАВЯДЗЕННЕ ПЕДАГАГІЧНЫХ ПРАКТЫК ЯК ШЛЯХ ПАВЫШЭННЯ ПРАФЕСІЙНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ НАСТАЎНІКАЎ

**А. В. Руцкая[1)], М. У. Грынько[2)]**

*[1)] Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 12 г. Гродна», вул. Паповіча, 32, 230024, г. Гродна, Беларусь, mgrynko@tut.by*
*[2)] Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, mgrynko@tut.by*

У артыкуле асвятляецца выкарыстанне педагагічных практык як мабільнага сродку разгляду актуальных праблем выкладання літаратуры ў школе. На прыкладзе выкарыстання графічнай нагляднасці (схем, алгарытмаў, табліц і інш.) падаюцца асноўныя формы працы падчас педагагічных практык.

***Ключавыя словы:*** прафесійны патэнцыял настаўніка; педагагічныя практыкі; структура педагагічных практык; праблемнае поле педагагічных практык; візуалізацыя матэрыялу.

# PEDAGOGICAL PRACTICES AS A WAY TO INCREASE PROFESSIONAL CAPACITY OF TEACHERS

**A. V. Rutskaja[a)], M. U. Hrynko[b)]**

*[a)] State educational institution «Secondary School № 12 Grodno», Papovich Street, 32, 230024, Grodno, Belarus, mgrynko@tut.by*
*[b)] Yanka Kupala State University of Grodno, Arzeszka Street, 22, 230023 Grodno, Belarus, mgrynko@tut.by*

The article covers the usage of pedagogical practices as a mobile tool for consideration of current problems of teaching literature at school. The main forms of work during pedagogical practices are given on the example of the use of graphic visibility (schemes, tables, algorithms, etc.)

***Key words:*** professional capacity of teachers; pedagogical practices; structure of pedagogical practices; problem area of pedagogical practices; vizualization of data.

Развіццё школьнай адукацыі залежыць ад многіх фактараў. У значнай ступені яно вызначаецца тым, наколькі эфектыўна працуе метадычная служба школы. Плённасць метадычнай службы ў сваю чаргу палягае ў адпаведнасці патрабаванням сённяшняга часу, у высокім узроўні інфармацыйнага забеспячэння настаўнікаў новымі падыходамі і тэхналогіямі. Доктар педагагічных навук В. У. Праскаловіч слушна падкрэслівае: «Інавацыі ў адукацыі варта разглядаць у якасці натуральнай і неабходнай умовы яе развіцця ў адпаведнасці з патрэбамі (сённяшнімі і перспектыўнымі) чалавека і грамадства» [1, с. 8]. У сваю чаргу варта адзначыць, што школьныя метадычныя аб’яднанні назапасілі значны вопыт работы па павышэнні педагагічнага майстэрства

настаўнікаў. Гэта і разнастайныя формы семінараў, творчыя справаздачы, круглыя сталы, экспрэс-вучоба, майстар-класы, якія па назвах успрымаюцца ўжо як традыцыйныя, звыклыя, але па метадах правядзення і транслюемых ведах яны канцэптуальна абноўленыя. Укараняюцца і новыя формы, і тым не менш, наша дынамічна зменлівае жыццё патрабуе няспыннага ўдасканалення, асноўная прыкмета якога – хуткае рэагаванне і аператыўны разгляд метадычных асноў вырашэння праблемных пытанняў. Азначаным патрабаванням адпавядае правядзенне *адукацыйных практык*. Дадзеная форма працы вызначаецца мабільнасцю і не вымагае працяглай і разгорнутай падрыхтоўкі. Яна можа быць выкарыстанай у межах правядзення пасяджэння метадычнага аб’яднання або як самастойнае аператыўнае абмеркаванне наспелай праблемы ці пры неабходнасці аналізу праробленай працы, а таксама перад працай, якая будзе выконвацца, напрыклад, да ажыццяўлення кіраўніцтва даследчымі працамі вучняў, да правядзення краязнаўчай працы, да падрыхтоўкі творчых інсталяцый і інш.

Тэмай адукацыйнай практыкі, як правіла, становіцца наспелая праблема (тое, што ўяўляе складанасць для настаўнікаў), формай правядзення з’яўляецца дыялог-абмеркаванне з выкарыстаннем неабходнага рабочага матэрыялу ў форме прэзентацыі, праз якую візуалізуюцца канкрэтныя недахопы і праблемныя моманты, што дае магчымасць яшчэ раз засяродзіць на іх увагу, пракаменціраваць, а таксама прадэманстраваць неабходныя ўзоры і прыклады. На аснове дэманструемага матэрыялу ўдзельнікі адукацыйнай практыкі сумесна выпрацоўваюць рэкамендацыі, якія дазволяць пазбегнуць вызначаных пралікаў і ўдасканаляць працу ў акрэсленым тэматычным напрамку. Структуру адукацыйных практык можна прадставіць наступнай табліцай:

Табліца

**Этапы и віды дзейнасці**

| *№* | *Этапы дзейнасці* | *Віды дзейнасці* |
|---|---|---|
| 1 | Вызначэнне праблемнага поля | Пералік праблемных пытанняў, вылучэнне пашыраных недахопаў, выяўленне таго, што найчасцей выклікае цяжкасці |
| 2 | Тэарэтычная частка | Інфакіёск, экспрэс-аналіз метадычнай літаратуры, актуалізацыя базавых паняццяў па выяўленых праблемах |
| 3 | Практычная частка | Абмеркаванне прыкладаў, узораў, прапановы, рэкамендацыі, варыянты |
| 4 | Падсумаванне | Ацэнка якасці і дзейснасці выпрацаваных рэкамендацый |

Першыя тры этапы дзейнасці суправаджаюцца ілюструючымі слайдамі прэзентацыі.

На сённяшні дзень як ніколі актуальным (бо сучасныя навучэнцы – гэта візуалы) з’яўляецца праблема выкарыстання розных відаў нагляднасці. Напрыклад, «застаецца актуальным пытанне аб літаратурнай графіцы, магчымасцях выкарыстання схем, графічных адлюстраванняў, лагічнага мадэліравання ў сувязі з псіхалагічнай пераарыентацыяй на камп’ютарызацыю, з новым ладам мыслення, логікі сучаснага вучня» [2, с. 21].

Праілюструем правядзенне адукацыйнай практыкі з мэтай удасканалення эфектыўнасці выкарыстання графічнай нагляднасці, якая візуалізуе вучэбную інфармацыю, дапамагае лагічна размежаваць матэрыял, дазваляе актывізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць.

Праца пачынаецца з таго, што ў праблемнае поле вылучаюцца найбольш пашыраныя пралікі. Да іх найчасцей адносяцца:

- падрыхтоўка графічнай нагляднасці;
- патрабаванні да яе афармлення;
- якасць зместавай напоўненасці;
- лагічнасць і дасканаласць заданняў.

Пры разглядзе дадзеных праблем варта дэманстраваць слайды з наступным зместам (мал. 1 и 2):

**ПАТРАБАВАННІ ДА СТВАРЭННЯ І АФАРМЛЕННЯ ГРАФІЧНАЙ НАГЛЯДНАСЦІ:**

- ***акуратнасць,***
- ***разборлівасць,***
- ***выразнасць,***
- ***самадастатковасць***

Малюнак 1 – Патрабаванні да стварэння і афармлення графічнай нагляднасці

**СТВАРЭННЕ НАГЛЯДНАСЦІ**

Графічная нагляднасць рыхтуецца ***самім настаўнікам*** ці ***даручаецца вучням***, але па эскізах і тлумачэннях настаўніка.

Настаўнік павінен правесці **кансультацыю** з вучнем, якому даручана стварыць той ці іншы від нагляднасці.

Малюнак 2 – Стварэнне нагляднасці

Настаўнікам прапануюцца рэкамендацыі як пазбегнуць праблем (мал. 3).

Калі вучань рыхтуе нейкую ***схему*** ці ***табліцу***, то выкладчыку варта паказаць некалькі ўзораў, ужо зробленых вучнямі нагляднасцей. Акрамя таго, неабходна звярнуць увагу дзяцей на тое, што павінна быць галоўным у нагляднасці, а што другасным (калі такая нагляднасць ствараецца пры дапамозе камп'ютара, то часткі нагляднасці павінны быць напісаны адпаведнымі шрыфтамі, кеглямі, а таксама, па магчымасці, выдзелены тым ці іншым колерам. Усё гэта будзе спрыяць лепшаму засваенню нагляднага матэрыялу і, разам з тым, выконваць вялікую эстэтычную функцыю.

Малюнак 3 – Рэкамедацыі настаўнікам

Далей ідзе разгляд канкрэтных прыкладаў.

Напрыклад: выкарыстанне кластараў, схем, табліц, апор не павінна быць арыентавана на фармальнае ўпрыгожанне ўрока, на гульню ў арыгінальнасць, на беспадстаўную забаўляльнасць, а вынікаць з задач урока, сутнасці выкладаемага матэрыялу. Уважліва трэба ставіцца і да ўваходзячага ва ўжытак прыёму пераўтварэння візуальнага матэрыялу, калі вучні пэўную форму нагляднасці замяняюць іншай. Так, знаёмячы вучняў з паняццем "ідэя твора", настаўнік прапануе прыведзеную ніжэй апору пераўтварыць у кластар, лічачы, што такім чынам глыбей будзе засвоена разуменне, праз што можа раскрывацца ідэя твора. Відавочна, што, азадачыўшы вучняў замяніць апору на табліцу з прыкладамі, настаўнік дапаможа больш грунтоўна засвоіць матэрыял. Дэманструецца ўзор (мал. 4).

***Ідэя можа раскрывацца:***

- у назве твора,
- у эпіграфе да твора,
- у фармулёўцы з двух-трох сказаў твора,
- у выказванні героя,
- у аўтарскім разважанні,
- усім зместам твора

Малюнак 4 – Раскрыццё ідэі твора

Табліца

**Ідэя твора**

| *Дзе раскрываецца* | *Прыклад* |
|---|---|
| 1. У назве твора | Апавяданне В. Быкава “Незагойная рана” |
| 2. У выказванні героя (цытата з твора) | Паэма Якуба Коласа “Новая зямля”:<br>*Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,*<br>*Каб з панскіх выпутацца пут* |
| 3. Аўтарскае разважанне | Паэма Якуба Коласа “Новая зямля”:<br>*Зямля не зменіць і не здрадзіць,*<br>*Зямля паможа і дарадзіць,*<br>*Зямля дасць волі, дасць і сілы,*<br>*Зямля паслужыць да магілы,*<br>*Зямля дзяцей тваіх не кіне,*<br>*Зямля — аснова ўсёй айчыне.* |

Прадстаўленне вучэбнага матэрыялу ў гатовай графічнай нагляднасці, безумоўна, служыць апорай для атрымання ведаў, але грунтоўнасць засваення значна павялічваецца, калі вучні далучаюцца да разгортвання і пашырэння зместу пададзенай нагляднасці. Настаўнікам можа быць прапанавана некалькі слайдаў для мадэлявання адпаведнай працы.

Так, слайд «Сюжэт» (гл. мал. 5) у першапачатковым выглядзе будзе ўтрымліваць толькі назвы элементаў сюжэта. Настаўнікі, удзельнікі адукацыйнай практыкі, змогуць прапанаваць розныя віды працы з вучнямі для ўдасканалення дадзенай схемы. Гэта можа быць праца з літаратуразнаўчым слоўнікам або з выведзеным на экран артыкулам са слоўніка, а можа быць набор азначэнняў, з якога вучні выберуць неабходныя. На аснове створанай схемы будзе рэалізоўвацца праца непасрэдна з мастацкім тэкстам. Падобных практычных узораў можа быць некалькі.




Малюнак 5 – Элементы сюжэта

На аснове выкананых практычных заданняў (яны павінны ахопліваць вылучаныя праблемы) настаўнікі супольна выпрацоўваюць рэкамендацыі, якія можна аформіць у выглядзе памяткі для ўдзельнікаў.

Тэматычны дыяпазон адукацыйных практык вельмі шырокі. А для іх выніковасці важна загадзя высветліць, якія праблемы маюць месца, каб аператыўна садзейнічаць павышэнню педагагічнай кампетэнцыі настаўнікаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Праскаловіч В. У.* Інавацыйная адукацыйная прастора філолага: рэаліі і перспектывы // Філалагічная адукацыя : навук-метад. зб. / рэдкал. : А. І. Бельскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2019. Вып. 3. С. 4–8.

2. *Дылеўская В. Ю.* Навучанне літаратуры: тэхналогіі, асновы інтэграцыі, кантэкст (да праблемы прафесійнай падрыхтоўкі студэнта-філолага) // Філалагічная адукацыя : навук-метад. зб. / рэдкал. : А. І. Бельскі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2019. Вып. 2. С. 20–25.